КУЛЬТУРА

# “Пінская шляхта” – гэта прыцягненне душы

Ірына АРЛОВА
Фота з архіва Пінскага каледжа мастацтваў

**Сапраўднай візітоўкай у шэрагу найяскравейшых адметнасцяў горада над Пінай з поўным правам можна назваць заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца “Пінская шляхта”. Акрамя таго, што гэта яркі, таленавіты гурт, артысты тонка і неназойліва даносяць да гледача адметную душу палешука.**





кавалак газетнай плошчы. Вось і зусім нядаўна артысты Пінскага каледжа мастацтваў прывезлі дыплом лаўрэата першай ступені III Рэспубліканскага конкурсу харэаграфічнага мастацтва “DANCE КОНГРЕСС” у намінацыі “Беларускі танец: традыцыя і навацыя”, які праходзіў напрыканцы красавіка ў Мінску. А самая высокая адзнака, кажуць артысты, – гучныя апладысменты гледачоў.

юныя артысты наогул адчуваюць сябе цэнтрам сусвету. А гледачы маюць выдатную магчымасць выказаць ім сваё захапленне і нават побач паспрабаваць танцавальны крок, стаць у карагод.

Рэпертуар калектыву пастаянна абнаўляецца. Шмат ствараецца сольных нумароў. Адкуль бяруцца ідэі? Па-рознаму. Нярэдка вобраз нараджае музыка – для гэтага ёсць у каледжы таленавіты ба-

перад высокай камісіяй з Міністэрства культуры народны ансамбль танца “Пінская шляхта” паказаў праграму на пацвярджэнне звання “Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь”.

## Буду артыстам!

Ну і, вядома ж, мы не маглі не пацікавіцца ў юных “шляхцюкоў”, навучэнцаў чацвёртага курса харэаграфічнага аддзялення, чым

## Вытанчанасць і манера

З'явіўся ансамбль у 1992 годзе ва ўстанове адукацыі, якая тады называлася Пінскае дзяржаўнае вучылішча мастацтваў. Ініцыятарам стварэння і першым кіраўніком калектыву стаў малады выкладчык харэаграфічных дысцыплін Валерый Жыльцоў. У першы склад ансамбля ўвайшлі маладыя, энергічныя выкладчыкі навучальнай установы, іх было ўсяго чатыры пары – восем чалавек.

У 1993 годзе калектыў даў свой першы канцэрт, а ўжо ў наступным яму было прысвоена ганаровае найменне "Народны", у 2019-м – званне "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь".

Зараз гуртом кіруе выкладчыца харэаграфіі Наталля Бархерыт, сама выпускніца вучэльні і шматгадовая ўдзельніца калектыву.

– Памятаю, які фурор мы зрабілі падчас першага фестывалю "Палескі карагод" – тады гісторыя наша толькі пачыналася. У нас былі проста шыкоўныя касцюмы – іх шылі ў тэатры, – узгадвае Наталля Уладзіміраўна. – З танцам "Хадзоны" – ад слова "хадзіць" ("паланэз" па-еўрапейску) мы ўрачыста прайшліся па Пінску. Усе ў захапленні пыталіся, хто вы, адкуль. Мы цалкам адрозніваліся ад іншых калектываў – сваёй шляхецкай манерай выканання. Увогуле, такая вытанчанасць, манернасць з першых дзён была самой атмасферай калектыву.

Усяго ў рэпертуары зараз – да паўсотні самых розных пастановак: танцы многіх народаў свету, апошнім часам з'явіліся і сучасныя, эстрадныя.

## "Кросны" і "Прасцяк"

Асабліва важны момант для кіраўніка і ўдзельнікаў калектыву – самабытнасць рэпертуару, захаванне нацыянальных традыцый. Юныя артысты з вялікай цікавасцю і задавальненнем знаёмяцца з народнай спадчынай свайго краю, вывучаюць танцавальны і музычны фальклор. Элементы народных гульняў, старадаўніх абрадаў і святаў знайшлі адлюстраванне ў харэаграфічных і фальклорна-абрадавых кампазіцыях. У рэпертуары ёсць танцы, "падгледжаныя" ў розных рэгіёнах Брэстчыны: на Лунінеччыне – беларускі народны танец "Кросны", на Іванаўшчыне – "Прасцяк", на Піншчыне – абрадавы карагод "На росу"...

Падчас заняткаў шмат увагі надаецца лексіцы народнага танца, пластыцы, тэхніцы выканання, мастацка-вобразнаму рашэнню кожнага твора. Каларыту дадае і жывое музычнае суправаджэнне інструментальнай групы – выкарыстанне ў рэпертуары самабытнага фальклору Палесся, які не можа не кранаць самыя тонкія струны душы. Тут гарманічна пераплятаюцца культура беларусаў, украінцаў, палякаў, яўрэяў. Такога не сустрэнеш больш нідзе.

"Пінская шляхта" – удзельніца шматлікіх фестываляў і конкурсаў як у Беларусі, так і за межамі краіны. Выканаўчае майстэрства калектыву неаднаразова адзначалася высокімі ўзнагародамі розных культурных форумаў, для пераліку іх спатрэбіцца добры адзнака, кажуць артысты, – гучныя апладысменты гледачоў.

## Жыватворная крыніца

Безумоўна, ансамбль мае сваю індывідуальнасць. Жывая фальклорная крыніца дае яму сілу, натхняе на творчы пошук. Ці варта казаць, што кожны выхад калектыву на сцэну – сапраўднае свята, якое пакідае незабыўныя і хвалюючыя ўражанні ў гледачоў. Змена кампазіцый, тэмпу, прыгожых касцюмаў выклікае ў залы менавіта гэткія эмоцыі, а юным артыстам дапамагае данесці да яго свае думкі, уражанні ў харэаграфічных вобразах. Вось чаму кожны канцэрт "Пінскай шляхты" – гэта нязменны поспех.

На сённяшні дзень у калектыве "па-шляхецку" танчаць 34 самых адораных дзіцяці Берасцейшчыны. Прэтэндэнты праходзяць двайны адсеў – спачатку, калі паступаюць у Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў, а потым з іх у ансамбль выбіраюць самых-самых. Словам, каб трапіць у "Пінскую шляхту", трэба быць проста пацалаваным Богам. Выкладчыкі ціха радуюцца, што такія дзеткі ёсць, і спадзяюцца, што ўкладзенае ў іх вернецца калі-небудзь і будзе служыць іншым пакаленням навучэнцаў каледжа.

## Ва ўсёй красе

– Танец – такі творчы працэс, калі кожны чалавек нясе ў ім сваю энергетыку, – удакладняе Наталля Уладзіміраўна. – Таму дзеці раскрываюцца па-рознаму. Летам мы нярэдка выступаем на пінскай пешаходцы – вуліцы Леніна. Тады нараджае музыка – для гэтага ёсць у каледжы таленавіты балетмайстар-рэпетытар Міхаіл Сеген, вялікі прыхільнік беларускага фальклору. А як не прыгадаць кіраўніка аркестра Рамана Банцэвіча? А што рабілі б творчыя асобы без адміністрацыі, якая ва ўсіх задумках ідзе насустрач? Адным словам, поспех творчага калектыву – гэта праца не толькі аднаго кіраўніка, а цэлай каманды з выкладчыкаў і гэткіх жа апантаных творчасцю навучэнцаў.

Пастаноўка новага нумару – справа даволі працаёмкая, расказвае кіраўнік гурта: калі рухі пастаянна паўтараюцца, калі балетмайстар хоча дабіцца дакладнага выканання пэўнага элемента альбо перадаць інтанацыю. А калі нумар вывучаны, калі, як кажуць танцоры, ён ужо "ў нагах", калі дзеці ўжо не задумваюцца пра тое, куды трэба павесці ручкай і як паставіць ножку, яны ў поўнай ступені могуць раскрыць свой характар, паказаць сябе ва ўсёй красе.

Аб творчых планах Наталля Бархерыт гаворыць стрымана – баіцца сурочыць. І ўсё ж прыадчыняе заслону: вельмі хацелася б узяць удзел у конкурсе "Балтыйская жамчужына", які адбудзецца ў чэрвені ў Санкт-Пецярбурзе. У рэпертуар, безумоўна, дабавяцца новыя пастаноўкі – бачыцца сучасная стылізацыя народнага танца, звязаная з купальскімі абрадамі. А яшчэ гораду рачнікоў – Пінску – хочацца падарыць матроскі танец: ёсць хлопцы, здольныя прадэманстраваць сябе ў акрабатычным стылі.

...Яшчэ адна важная падзея адбылася днямі ў жыцці калектыву: навучэнцаў чацвёртага курса харэаграфічнага аддзялення, чым прыцягвае іх калектыў.

**Уладзіслаў БУРЭЦ:**

– Я прыехаў з Баранавічаў спасцігаць найперш эстэтыку танца. Мне вельмі падабаецца беларускі народны танец, яго культура. З Валерыем Віктаравічам Жыльцовым сустракаўся яшчэ да паступлення ў каледж на многіх абласных і рэспубліканскіх канцэртах – я танцаваў тады ў заслужаным калектыве бальнага танца "Фіеста" ў Баранавічах – і ён мяне адразу на першым жа курсе запрасіў у калектыў.

Тут мне па душы тое, што мы можам паказаць гледачам свае эмоцыі, народную культуру. Мы аддаём ім энергію, але атрымоўваем шмат болей. Ад гэтага хочацца працаваць удвая больш. Сёння ў нас было размеркаванне – мяне накіравалі ў знакаміты беларускі ансамбль "Харошкі".

**Аліна ГЕРМАНОВІЧ:**

– Харэаграфіяй я пачала займацца з самага дзяцінства. Проста ўлюбілася ў гэты від мастацтва і ўжо не ўяўляю без яго жыцця. У калектыў мяне запрасілі таксама на першым курсе. Першую сваю рэпетыцыю выдатна памятаю і сёння – як было хвалююча. Але з першых жа дзён мы пачалі працаваць. Наш рэпертуар надзвычай разнастайны – ёсць і старадаўнія беларускія танцы, і сучасная харэаграфія, больш эстрадныя. Ёсць усе стылі – тым і цікава. Але ўсё ж я больш люблю народны танец. У Пінскай дзіцячай школе мастацтваў буду працаваць педагогам, выкладаць танец.